■ Віншуем!

«УПЛЯТАЦЬ У СЛОВА, ЯК У МАЛІТВУ»

Сёння свой юбілей святкуе доктар гістарычных навук, прафесар Інстытута журналістыкі БДУ Алег Георгіевіч СЛУКА.
Маё знаёмства з Алегам Георгіевічам пачалося ў першы дзень заняткаў на журфаку. Па традыцыі, 1 верасня ў Інстытуце журналістыкі для першакурснікаў ладзяць цікавыя сустрэчы, так званыя майстар-класы з карыфеямі журналістыкі...

Так і тады, яшчэ зусім «зялёныя» і шчаслівыя ад таго, што паступілі на адзін з прэстыжнейшых факультэтаў галоўнай ВНУ краіны, мы сядзелі ў актавай зале прыгожага будынка, паглыбляліся ў прафесію і знаёміліся з выкладчыкамі. Здаецца, даўно было, але я і сёння памятаю выступленне Алега Слукі. Не змест, вядома. У маёй памяці — яго эмоцыі, жэстыкуляцыя, тактычныя звароты «калегі» — да нас яшчэ ніхто ў жыцці так не звяртаўся! Прафесар не карыстаўся ніякімі канспектамі і дапаможнікамі — дзякуючы свайму вялікаму вопыту ён добра ведаў, як зацікавіць учарашніх школьнікаў. Ужо тады мы зразумелі, што недарэмна выбралі гэтую прафесію.

Сам Алег Георгіевіч скончыў факультэт журналістыкі БДУ ў 1968 годзе і адразу ж паступіў у аспірантуру. Адну за адной ён мяняў высокія пасады: загадчык падрыхтоўчага аддзялення БДУ, намеснік сакратара парткама па ідэалагічнай рабоце, дэкан факультэта журналістыкі БДУ, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, намеснік міністра адукацыі, рэктар Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, прафесар кафедры гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ Інстытута журналістыкі БДУ.

Колькі ахвотных было запісацца на спецкурс да прафесара! Я туды не трапіла: спіс быў ужо перапоўнены. Студэнтаў падкупляла нязмушаная форма выкладання Алега Георгіевіча. Усе ведалі і тое, што гэты выкладчык раскажа нешта новае і карыснае, а галоўнае, вельмі патрэбнае нам, маладым журналістам. Пра сябе прафесар казаў мала, а, між іншым, лёс яго не песціў.

Нарадзіўся Алег Слука ў звычайнай сялянскай сям'і ў вёсцы Лабковіца, што ў Асіповіцкім раёне. З'явіўся на свет у вельмі няпросты час — толькі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Бацька пайшоў на фронт. Тры сыны, ды яшчэ гаспадарка, усё лягло на плечы маці. Усе цяжкасці акупацыі не прайшлі міма іх, але сям'ю ўдалося захаваць. Бацька з вайны вярнуўся, ды праз год яго не стала — нагадала пра сябе вайна.

У сваёй вёсцы Алег Слука скончыў дзесяцігодку. Тут жа, у калгасе, адразу пасля школы і працаваў. З будучай прафесіяй вызначыўся ў апошніх класах. Нават скончыў курсы юнкараў пры «Знамени юности». Але перш чым паступіць ва ўніверсітэт, трэба было два гады папрацаваць. Набіраўся вопыту ў Кандалакшы. Потым была служба ў арміі. І толькі пасля — доўгачаканы журфак.

«Нешта з боскай вышыні падказала: «Ты ж ідзі вось па гэтым шляху, каб у жыцці ўбачыць нешта ўзнёслае, нешта прыгожае, што ствараюць людзі, — казаў у адным з інтэрв'ю Алег Георгіевіч. — Журналіст не толькі лунае над зямлёй. Яго паэзія — ісці ад жыцця, бачыць, што чалавек робіць, і тады ўзносіць гэта, уплятаць у слова, як у малітву».

Амаль усё жыццё Алег Слука прысвяціў журналістыцы. Яго вопыт працы ў сродках масавай інфармацыі небагаты, але больш за яго пра гісторыю журналістыкі, напэўна, не ведае ніхто. Ні адна курсавая работа не абыходзілася без звароту да падручнікаў, над якімі скрупулёзна ў свой час працаваў прафесар. У тым ліку па выданнях пад яго аўтарствам падчас працы над дыпломам і магістарскай дысертацыяй я даследавала гісторыю найстарэйшай газеты «Звязда».

Алег Георгіевіч быў у камісіі, калі я паступала ў магістратуру. Прызнаюся, з такім знаўцам гісторыі беларускай журналістыкі праваліць іспыт было вельмі лёгка. Але прафесар — нават не ведаю такіх выпадкаў — ніколі не «завальваў» студэнтаў, не прыніжаў, а наадварот, увесь час падтрымліваў і знаходзіў у такіх важных для нас выступленнях нешта адметнае. І сёння з галавы не выходзіць, як падчас маёй абароны дыпломнай работы Алег Георгіевіч — вялікі прафесар! — устаў і выказаў удзячнасць за зварот да абранай тэмы.

Сам Алег Слука абараніў дзве дысертацыі — кандыдацкую і доктарскую. На яго рахунку — 16 кніг, манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, вялікая колькасць навуковых публікацый. Дарэчы, менавіта з лёгкай рукі прафесара ўбачыў свет падручнік «Беларуская журналістыка» — першае найбольш поўнае даследаванне па гісторыі журналістыкі.

За сваю самаадданую працу на ніве журналістыкі і ў іншых галінах жыццядзейнасці Алег Георгіевіч станавіўся лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі, прэмій «Залатое пяро», імя акадэміка Пічэты. Алег Слука па праве носіць званні заслужанага журналіста Беларускага саюза журналістаў, выдатніка друку і адукацыі.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» віншуе Алега Георгіевіча з юбілеем і зычыць, каб навуковая і творчая скарбонка прафесара папаўнялася новымі званнямі і ўзнагародамі! Моцнага здароўя, плёну ў прафесійнай дзейнасці, міру і гармоніі ў сям'і!

ШАГАЛ ПА ВІЦЕБСКУ

У Віцебску адсвяткавалі 129-ю гадавіну з дня нараджэння Марка Шагала. Пасля 19-гадовага перапынку адбыўся міжнародны пленэр, прысвечаны Майстру. У ім бралі ўдзел мастакі з Расіі, Беларусі, Латвіі, Германіі.

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Шагалаўскія пленэры да гэтага праводзіліся ў 1994 і 1997 гадах. Як падкрэслілі ў музеі Шагала ў Віцебску, тады яны былі больш маштабнымі. Дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры, збіралі каля 40 мастакоў. І тады культурная падзея выклікала добры рэзананс на міжнародным узроўні.

Нягледзячы на такі доўгі перапынак, арганізатарам сёлетняга пленэру не прыйшлося доўга шукаць кандыдатаў для паездкі ў Віцебск. На працягу 1,5 тыдня 10 мастакоў, якія працуюць у розных жанрах, працавалі над сваімі творамі. У вольны час наведвалі мясціны, звязаныя з Шагалам, музеі, у тым ліку і ў Полацку.

Тэмы для сваіх карцін яны выбіралі самі. Адзіная ўмова арганізатараў — мастакі былі абавязаны падарыць па два творы. У выніку ў музейны фонд перадалі 20 палотнаў. Іх творы таксама можна будзе ўбачыць у дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Падчас прэзентацыі вынікаў пленэру арганізатары падкрэслілі, што будуць рабіць усё магчымае, каб не было больш такой працяглай паўзы. Ёсць надзея, што наступны раз мастакі з розных краін змогуць ужо праз год папрацаваць у горадзе над Заходняй Дзвіной.

Па добрай традыцыі ў дзень нараджэння Марка Шагала ў дворыку дома, дзе ён жыў (на вуліцы Пакроўскай, недалёка ад аўтавакзала) адбылося свята «У гасцях у Марка і Бэлы». Гэта адзін з віцебскіх культурных «брэндаў». Публіка ўбачыла выступленні самадзейных калектываў, артыстаў. Многія з іх частыя і жаданыя госці на розных фэстах. Гучалі яўрэйскія песні, іграла скрыпка, усе ахвотныя маглі далучыцца да танцораў. Не абышлося без яўрэйскага гумару. Прыемным сюрпрызам сталі ружы сорту «Марк Шагал».

У наступным годзе шырока адсвяткуюць 130-гадовы юбілей мастака. Ужо распрацоўваюцца планы. Чакаецца прыезд з-за мяжы ўнучак Шагала. Нагадаю, што нядаўна ў Віцебску з'явілася вуліца, якая носіць імя славутага сына віцебскай зямлі. І так хочацца верыць, што калісьці на малой радзіме Шагала назаўсёды застанецца хаця бы адна з арыгінальных жывапісных работ. Графіку можна ўбачыць у мясцовым музеі, а вось жывапісу няма.

Аляксандр ПУКШАНСКІ
pukshanski@zviazda.by

МОЦНЫЯ КАРАНЯМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Павіншаваць удзельнікаў і гасцей свята прыехалі намеснікі прэм'ер-міністра Беларусі Наталля Качанава (яна ж старшыня аргкамітэта свята) і Міхаіл Русы, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Бузоўскі, старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Дамашеўскі, міністр культуры Барыс Святлоў і міністр інфармацыі Лілія Ананіч, міністр гандлю Уладзімір Калтовіч, памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў, першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі Леанід Марыніч.

— Сёння гэта свята можна параўнаць з паўнаводнай ракой Днепр, якая аб'ядноўвае ўсё больш людзей вакол сябе, — адзначыў у сваёй прамове кіраўнік вобласці Уладзімір Даманеўскі.

— Чарговы раз александрыйская зямля прымае яркае, знакавае свята Купалле, якое стала нацыянальным здабыткам. Тут сустракаюцца людзі розных пакаленняў, краін, нацыянальнасцяў. У кожнага ёсць магчымасць падзяліцца сваёй творчасцю, вопытам, дакрануцца да вытокаў культуры, якая аб'ядноўвае нашы славянскія народы. Дзякуючы дзяржаўнай палітыцы, якая праводзіцца пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі, гэта свята стала нацыянальным культурным сімвалам, які накіраваны на развіццё і захаванне нашых традыцый і культуры. Вельмі важна, каб яны перадаваліся маладому пакаленню. Толькі пры гэтай умове мы зможам упэўнена глядзець у будучае, — гэтымі словамі Наталля Качанава на правах гаспадыні аб'явіла адкрыццё свята.

За паўгадзіны да гэтага намеснік прэм'ер-міністра, з якой мы сутыкнуліся на парозе Александрыйскай школы, прызналася: ехала і перажывала, што дождж усё сапсуе. Прыехала, а тут сонейка. І столькі прыгожых шчаслівых твараў. Нават надвор'е нам спрыяе.

Свята пачынаецца... са школы

Александрыйская школа — мясцовая славутасць, якую наведвальнікі тутэйшых мясцін імкнуцца пабачыць у першую чаргу. Побач з сучасным двухпавярховым будынкам знаходзіцца аднапавярховы драўляны. Тут калісьці сядзеў за партай кіраўнік нашай краіны. У будынку школы ёсць некалькі музейных пакояў, адзін з якіх цалкам прысвечаны Аляксандру Лукашэнку. Анатоль Казлоўскі, дырэктар школы, кажа, што падчас Купалля толькі за адну гадзіну з экспанатамі знаёмілася каля 40 чалавек. У музеі 6 экспазіцый, якія адлюстроўваюць усю гісторыю гэтага краю. Самы каштоўны экспанат — пячатка Аляксандра Хаткевіча, заснавальніка вёскі.

На час Купалля Александрыйская школа становіцца не толькі месцам паломніцтва турыстаў, але і добрай базай для падрыхтоўкі артыстаў да канцэрта. Ад яе да месца падзей усяго некалькі сот метраў. Сёлета ў школе рыхтавалі грымёрку для Таісіі Павалій. У мінулыя гады тут прыводзіла сябе ў парадак Вера Брэжнева.

Фота БЕЛТА.

На свяце ўпершыню прымаў гасцей «Друкарскі двор» з кніжнай прадукцыяй і дэманстрацыяй працэсу кнігадрукавання.

Ад бразготкі да махотачкі

Ад той колькасці самабытнага і аўтэнтычнага, што было прадстаўлена на фэсце, вочы разбягаліся.

— Мы прывезлі на свята цацкі, кераміку, карціны, вышыўку, — рэкламавала сябе і сваіх калег народная майстрыха з Хмяльніцкай вобласці Украіны Галіна Шуміла.

Галіна з мужам займаюцца адраджэннем старадаўніх яварыўскіх цацак у выглядзе птушачак, конікаў, зайчыкаў, куранятак, робяць свістулькі і ляскоткі, якія сваімі гукамі адганяюць злых духаў. У Беларусі Галіна ўпершыню, хаця са сваімі вырабамі ўжо аб'ехала ўсю Украіну і Польшчу. Вельмі хацела б пабываць на Славянскім базары ў Віцебску. Сёлета ёй не пашчасціла. Ахвотных трапіць на фестываль у Віцебску зашмат, трэба было падаваць заяўку за некалькі месяцаў. Але Галіна спадзяецца, што ёй пашчасціць у наступным годзе. Ёй ёсць што паказаць. У яе калекцыі шмат цацак, якія зараз не прадаюцца. «Яны сонечныя, прыгожыя, без хіміі і лакаў», — запэўнівае майстрыха.

Майстар па ганчарным мастацтве Пётр Касмакоў з горада Лебядзянь Ліпецкай вобласці Расіі таксама ўпершыню на Купаллі ў Александрыі.

— У тутэйшага свята ёсць нешта агульнае з нашымі, але тут крыху незвычайная абстаноўка — больш памяркоўная, — прызнаўся ён. — І праграма фестывалю цікавая. Наогул, я вельмі кануты цёплым прыёмам і гасціннасцю беларусаў.

Майстар займаецца вырабам прадметаў быту па старадаўніх тэхналогіях. Свае збанкі і гладышы ён параўноўвае з людзьмі. Гаршчочак па–ягонаму мае мужчынскі пачатак, там гатуецца каша, мяса. А калі махотачку ўзяць (або па нашаму гладыш), у яе жаночыя формы — вузкая талія, шырокія сцёгны. Майстар бярэ ў рукі свістульку ў выглядзе парсюка. «У носік дзьмеш, пузіка чэшаш, ён песеньку спявае», — усміхаецца ён. А пра невялічкія ладанкі кажа, што яны прыносяць шчасце.

Бард-рыбалка як частка Купалля

Купалле — мультыкультурная падзея, і на ім былі прадстаўлены шматлікія фестывалі, якімі багаты Магілёўскі рэгіён. Адным з арганізатараў пляцоўкі «Маладзёжная» стаў Сяргей Кулягін, які прадстаўляў міжнароднае музычна-спартыўнае свята Вялікая бард-рыбалка. Яно, дарэчы, адбудзецца зусім хутка, у апошнія выхадныя ліпеня. Прыхільнікі песень пад гітару і пасядзелак каля вогнішча разбілі міні-турыстычны лагер, арганізавалі мабільную лазню. Яшчэ адна, перасовачная, — эксперыментальны варыянт якой зроблены ў Шклове на шасі ЗІЛа, працавала побач. За 20 новых рублёў можна было ад душы папарыцца і памыцца.

Наогул, Александрыйскае свята было багата на розныя конкурсы, прэзентацыі, майстар-класы. Была магчымасць паглядзець на ўзоры лепшых дасягненняў у галіне жывёлагадоўлі і раслінаводства. Шмат уражанняў выклікалі паказальныя выступленні конна-спартыўнай школы і дэманстрацыйныя палёты самалётаў ДТСААФ.

Галоўнай падзеяй першага дня двухдзённага свята стаў вялікі гала-канцэрт «Купальская казка», на якім прысутнічаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Пасля феерычнага шоу неба над Александрыяй расквеціў шыкоўны феерверк і далёка ўгару ўзнялося полымя самага вялікага купальскага вогнішча. А хвалі Дняпра яшчэ доўга потым неслі гукі купальскага свята разам са святочнымі вянкамі на шмат кіламетраў па цячэнні.

Нэлі ЗІГУЛЯ.